УДК: 930(477) : 94 (476) “1921– 1939”

**А. М. Загідулін,** кандыдат гістарычных навук, дацэнт
Установа адукацыі «Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы», вул. Э. Ажэшка, 22,
230023, Гродна, Рэспубліка Беларусь, azagidulin@tut.by

# ПРАБЛЕМА НАЙМЕННЯ БЕЛАРУСКІХ І ЎКРАІНСКІХ ЗЯМЕЛЬ У СКЛАДЗЕ ПОЛЬШЧЫ (1921—1939) У СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ І ЎКРАІНСКАЙ ГІСТАРЫЯГРАФІІ

Мэта артыкула — выявіць асноўныя варыянты назвы тэрыторыі кампактнага пражывання беларусаў і ўкраінцаў у складзе Польшчы ў 20—30-я гады ХХ стагоддзя ў сучаснай беларускай і ўкраінскай гістарыяграфіі.

На аснове вывучэння беларускай, польскай і украінскай гістарыяграфій з выкарыстаннем параўнаўчага метада даследуецца сучасная навуковая дыскусія вакол вызначэння паняццяў «Заходняя Беларусь» і «Заходняя Украіна».

У сучаснай беларускай гістарыяграфіі тэрмін «Заходняя Беларусь» мае ўстойлівае значэнне і абазначае беларускія тэрыторыі, што знаходзіліся ў складзе Польшчы з 1921 па 1939 год. Польская гістарыягафія адмаўляе тэрміны «Заходняя Беларусь» и «Заходняя Украіна». Ва ўкраінскай гістарыяграфіі тэрмін «Заходняя Украіна» выкарыстоўваецца пераважна ў савецкі час, у сучаснай гістарычнай навуцы дадзены тэрмін не з'яўляецца ўстойлівым для адназначнага вызначэння ўкраінскіх зямель у складзе Польшчы. У дадзены момант украінскія вучоныя часцей выкарыстоўваюць традыцыйныя гісторыка-геаграфічныя назвы «Галічына», «Заходняя Валынь», «Холмшчына», «Падляшша», «Палессе».

**Ключавыя словы:** беларуская гістарыяграфія; украінская гістарыяграфія, Заходняя Беларусь; Заходняя Украіна; Усходняя Галічына; Заходняя Валынь; Холмшчына; Падляшша; Палессе.
Бібліягр.: 22 назв.

**A. M. Zahidulin,** PhD in History, Associate Professor
Yanka Kupala State University of Grodno, 22 Orzheshko Str., 230023 Grodno,
the Republic of Belarus, azagidulin@tut.by

# THE PROBLEM OF NAMING OF BELARUSIAN AND UKRAINIAN LANDS WITHIN POLAND (1921—1939) IN MODERN BELARUSIAN AND UKRAINIAN HISTORIOGRAPHY

The objective is to identify the main variants of the name of the territory of compact residence of Belarusians and Ukrainians within Poland in the 20—30s of the XX century in modern Belarusian and Ukrainian historiography. Based on the study of Belarusian, Polish and Ukrainian historiography with the use of a comparative method, the author examines the modern scientific discussion around the definition of the concepts of “Western Belarus” and “Western Ukraine”.

In modern Belarusian historiography the term “Western Belarus” has a stable meaning and means the Belarusian territories that were part of Poland from 1921 to 1939. Polish historiography rejects the terms “Western Belarus” and “Western Ukraine”. In Ukrainian historiography, the term “Western Ukraine” was used mainly in the Soviet era; in modern historical science, this term is not stable for an unambiguous definition of Ukrainian lands within Poland. Ukrainian scientists more often use traditional historical and geographical names of Eastern Galicia, Western Volyn, Kholmshchyna, Podlasie, Polesie.

**Key words:** Belarusian historiography; Ukrainian historiography; Western Belarus; Western Ukraine; Eastern Galicia; Western Volyn; Kholmshchyna; Podlasie; Polesie.
Ref.: 22 titles.

**Уводзіны.** Гісторык, абіраючы для сябе прадмет даследавання, вызначае геаграфічныя межы, у якіх дадзены прадмет намерваецца вывучаць. Часам гэтую працэдуру ўскладняюць неадпаведнасць тэрыторыі працякання вывучаемых гістарычных працэсаў з тагачасным адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзелам. У 20—30-я гады ХХ стагоддзя заходняя частка бела-

© Загідулін А. М., 2021

рускіх зямель уваходзіла ў склад Польшчы. Дадзеную тэрыторыю пражывання беларусаў у Польшчы ў савецкай і сучаснай беларускай гістарыяграфіі прынята абазначаць тэрмінам «Заходняя Беларусь». Нягледзячы на шырокае распаўсюджанне тэрміна, геграфічныя межы «Заходняй Беларусі» і, адпаведна, колькасць і склад насельніцтва вызначыць дакладна ніхто не можа. Тэрыторыя, што ўвайшла ў 1921 годзе у склад Польшчы, не тоесная тэрыторыі, што вярнулася ў 1939 годзе у БССР, да таго ж далёка не ўся яна трапіла ў пасляваенную БССР і сучасную Рэспубліку Беларусь.

Падобная сітуацыя склалася і ва Украіне. Частка ўкраінскіх зямель таксама ўваходзіла ў 1920—1930-х гадах у склад Польшчы, а ў 1939 годзе была ўключана ў склад СССР. Актуальнасць дадзенага даследавання заключаецца ў магчымасці параўнання падыходаў беларускіх і ўкраінскіх гісторыкаў да вызначэння і наймення беларускіх і украінскіх тэрыторый і рэгіёнаў, што ўваходзілі ў склад Польшчы ў міжваенны час.

**Матэрыялы і метады даследавання.** Мэта нашага даследавання — выявіць асноўныя варыянты назвы тэрыторыі кампактнага пражывання беларусаў і ўкраінцаў у складзе Польшчы ў 20—30-я гады XX стагоддзя ў сучаснай беларускай і ўкраінскай гістарыяграфіі.

Метадалагічную аснову даследавання складаюць гісторыка-параўнаўчы, гісторыка-генетычны і гісторыка-сістэмны метады. Работа грунтуецца на прынцыпах гістарызму і аб'ектыўнасці.

Беларускія і ўкраінскія савецкія гісторыкі адназначна ўжывалі паняцце «Заходняя Беларусь» і «Заходняя Украіна», таму ў артыкуле асноўная ўвага сфакусіравана на аналізе постсавецкай беларускай і ўкраінскай гістарыяграфіі. Прадметам даследавання з'яўляецца беларуская і ўкраінская гістарыяграфія 80-х гадоў XX — пачатку XXI стагоддзяў.

Моцную блытаніну ў беларускай гістарыяграфіі ў вызначэнні тэрыторыі і насельніцтва, здаецца, усім вядомай Заходняй Беларусі выдатна праілюстраваў У. М. Міхнюк [1]. Ён цытуе шэраг беларускіх даследчыкаў, якія называюць розныя лічбы памераў тэрыторыі і колькасці насельніцтва ў адносінах да аднаго рэгіёна — Заходняй Беларусі. Прааналізаваць вызначэнне беларускімі гісторыкамі тэрыторыі Заходняй Беларусі спрабуе А. Трафімчык [2].

Да пытання разнастайнасці акрэслення геаграфічных межаў Заходняй Беларусі звярталіся і польскія гісторыкі, напрыклад Я. Е. Мілеўскі [3], Я. Шумскі [4, с. 20—23].

Згаданыя гісторыкі прыходзяць да высновы, што праблема вызначэння дакладных геаграфічных межаў Заходняй Беларусі ўскладняецца шэрагам фактараў, асноўны з якіх — адсутнасць адзінадушша ў вырашэнні пытання далучэння Віленшчыны з Беласточчынай да Заходняй Беларусі, а калі далучаць, то ў якіх памерах. Немагчымасць дакладна вызначыць геаграфічныя межы даследавання беларусаў у складзе міжваеннай Польшчы прыводзіць да неадназначнасці вынікаў навуковых даследаванняў на іншую тэматыку.

Падагуліў гістарыяграфію паняцця «Заходняя Беларусь» А. А. Савіч, прысвяціўшы гэтаму цэлы раздзел сваёй манаграфіі. Ён адзначае, што грунтоўнае гісторыка-дэмаграфічнае даследаванне тэрыторыі і насельніцтва Заходняй Беларусі яшчэ наперадзе. А. А. Савіч перакананы, што за аснову вызначэння тэрыторыі Заходняй Беларусі трэба браць адпаведную беларускую этнічную тэрыторыю, якая гістарычна сфарміравалася да пачатку Першай сусветнай вайны [5, с. 54].

Сучасныя беларускія гісторыкі, каб пазбегнуць у сваім даследаванні блытаніны, выкліканай неадназначнасцю тэрыторыі, якую займае Заходняя Беларусь, пры вызначэнні геаграфічных межаў даследавання пералічваюць канкрэтныя паветы ваяводстваў Польшчы [6, с. 7].

Сярод украінскіх гісторыкаў найбольш глыбока вывучаў гістарыяграфічную праблему наймення заходнеўкраінскіх земляў у складзе Польшчы Я. Вярменіч [7].

У дадзенай сітуацыі ёсць сэнс параўнаць як сіметрычную праблему вызначэння тэрыторыі Заходняй Украіны ў складзе Польшчы вырашае ўкраінская гістарыяграфія.

**Вынікі даследавання і іх абмеркаванне.** Тэрмін «Заходняя Беларусь» лічыцца агульнаўжывальным толькі ў беларускай гістарыяграфіі. Польскія гісторыкі негатыўна ставяцца да выкарыстання гэтай назвы, лічачы, што яна ўказвае на этнічную прыналежнасць дадзенай

тэрыторыі. У працах польскіх аўтараў і гістарычных дакументах польскага паходжання выкарыстоўваюцца тэрміны «паўночна-ўсходнія крэсы (ускраіны)», «усходнія ваяводствы», «паўночна-ўсходнія ўскраінныя землі ІІ Рэчы Паспалітай». Польскія гісторыкі А. Бергман, Я. Е. Мілеўскі звязваюць паходжанне тэрміна «Заходняя Беларусь» з Камуністычнай партыяй Заходняй Беларусі (КПЗБ), створанай у кастрычніку 1923 года, якая мела на мэце далучыць гэту тэрыторыю да БССР, што і дэманстравала сваёй назвай [8, с. 9—10; 3]. І. І. Коўкель пярэчыць польскім вучоным і называе часам узнікнення тэрміна восень 1920 года. На яго думку, Заходняй Беларуссю павінна была называцца буферная дзяржава, што складалася з беларускіх зямель былых Віленскай і Гродзенскай губерняў, якая на правах аўтаноміі магла ўвайсці ў склад Польшчы [9]. Гэта пытанне, як сцвярджае І. І. Коўкель, абмяркоўвалася падчас сустрэчы А. Луцкевіча і Ю. Пілсудскага. У. М. Міхнюк аналізуе пазіцыі розных беларускіх вучоных адносна тэрыторыі, якую займала Заходняя Беларусь у складзе Польшчы [1]. У яго даследаванні вызначаюцца дзве асноўныя прынцыповыя канцэпцыі разумення геаграфічных межаў Заходняй Беларусі ў сучаснай беларускай гістарыяграфіі: першая ўключае ў сябе тэрыторыю пасляваеннай БССР і сучаснай Рэспублікі Беларусь, што з 1921 па 1939 год знаходзілася ў складзе Польшчы; другая — тэрыторыю, заселеную пераважна беларускім насельніцтвам, што па выніках Рыжскага мірнага дагавора адышла Польшчы (дадзеная канцэпцыя адрозніваецца ад першай уключэннем у склад Заходняй Беларусі Вільні і Віленшчыны, а таксама Беластока і Беласточчыны).

Ва ўкраінскай гістарыяграфіі і грамадскай думцы таксама існуе тэрмін «Заходняя Украіна». Але сітуацыя з гэтай назвай больш складаная. Калі «Заходняя Беларусь» у беларускай гістарыяграфіі — тэрмін досыць адназначны, то пад Заходняй Украінай у сучаснай украінскай гістарыяграфіі разумеюцца розныя тэрыторыі ў розныя гістарычныя эпохі. Па-першае, пасля падзелу ўкраінскіх зямель па Дняпры ў сярэдзіне XVII стагоддзя тэрмін «Заходняя Украіна» выкарыстоўваўся для тэрыторый, што не трапілі ў склад Расіі. Па-другое, адносна перыяду пасля падзелаў Рэчы Паспалітай, украінскія гісторыкі пад Заходняй Украінай разумеюць тэрыторыі, якія ўвайшлі ў склад Аўстрыі, пазней Аўстра-Венгрыі. Па-трэцяе, Заходняя Украіна — тэрыторыя, што ў 20—30-я гады XX стагоддзя знаходзілася ў складзе Польшчы. Адносна апошняга перыяду сярод украінскіх гісторыкаў няма адзінадушша. Адназначна ўсе ўкраінскія землі ў складзе Польшчы называе Заходняй Украінай савецкая ўкраінская гістарыяграфія, што вывучае традыцыйныя для марксісцкай гістарыяграфіі пытанні [10]. Праўда, традыцыі савецкай гістарыяграфіі можна прасачыць і ў сучасных манаграфіях, дзе прадметам даследавання выступаюць з'явы і падзеі, вывучэнне якіх было актуальна ў савецкі час: нацыянальна-вызваленая барацьба, грамадска-палітычны рух, дзейнасць таварыства «Просвіта» і інш. Тут геаграфічнымі межамі выступаюць землі Заходняй Украіны [11; 12].

У постсавецкі час большасць украінскіх аўтараў, што даследуюць украінскую тэматыку міжваеннай Польшчы, імкнецца пазбягаць тэрміна «Заходняя Украіна». Справа ў тым, што ўкраінскія рэгіёны, якія ў 20—30-я гады знаходзіліся ў складзе Польшчы, маюць свае традыцыйныя гісторыка-геаграфічныя назвы: Заходняя Валынь, Усходняя Галічына, Холмшчына, Падляшша і Палессе. Усходняя Галічына — частка былой Галічыны, што мела аўтаномію ў складзе Аўстра-Венгрыі. Пазней на яе тэрыторыі Польшча ўтварыла тры ваяводствы: Львоўскае, Станіславоўскае і Тарнопальскае. Прычым большая заходняя частка Львоўскага ваяводства займала карэнныя польскія тэрыторыі з польскім насельнітцвам. У выніку савецка-польскай вайны ў склад Польшчы трапілі землі, што раней знаходзіліся ў складзе Расійскай імперыі. Тут у лютым 1921 года былі ўтвораны Валынскае (з цэнтрам у Луцку), Палескае (цэнтр — Брэст) і Навагрудскае ваяводствы. Знакаміты ўкраінскі гісторык, спецыяліст па праблемах міжваеннага перыяду С. Кульчыцкі ў адным з тамоў 15-томнай агляднай гісторыі Украіны «Україна крізь віки» тры апошнія згаданыя ваяводствы называе паўночна-заходнімі землямі (у адносінах да ўсёй украінскай тэрыторыі) [13]. Польская ўлада імкнулася захаваць падзел паміж былымі аўстрыйскімі і расійскімі тэрыторыямі і нават захавала былую мяжу паміж Расійскай імперыяй і Аўстра-Венгрыяй — так званы Сакольскі кардон. Такім чынам, Заходняя

Украіна ўяўляла сабой досыць неакрэсленую і неаднародную тэрыторыю, куды ўваходзіла адасобленая Усходняя Галічына і ваяводствы, якія беларуская гістарыяграфія адносіць часткова да Заходняй Беларусі (размова ідзе пра Палескае ваяводства). Пытанне тэрытарыяльнага размежавання Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі пакуль застаецца адкрытым.

У сучаснай украінскай гістарыяграфіі часцей выкарыстоўваецца рэгіяналістычны падыход і ўсё больш з'яўляецца прац, што вывучаюць разнастайныя праблемы ў межах не Заходняй Украіны, а менавіта згаданых гісторыка-геаграфічных рэгіёнаў (Усходняй Галічыны, Заходняй Валыні, Холмшчыны, Падляшша і Палесся [14—18]) або канкрэтных ваяводстваў [19].

Варта адзначыць, што С. Кульчыцкі без ваганняў лічыць Палессе ўкраінскай тэрыторыяй. У дачыненні да іншых украінскіх тэрыторый, што апынуліся ў складзе Польшчы, С. Кульчыцкі прыводзіць дадзеныя аб нацыянальным складзе насельніцтва ў працэнтах, даказваючы наяўнасцю ўкраінцаў прыналежнасць рэгіёнаў да Заходняй Украіны. Гаворачы пра Палессе, такіх доказаў з указаннем працэнтаў аўтар не дае. Згадваючы нізкі ўзровень нацыянальнай самасвядомасці жыхароў Палесся, прафесар С. Кульчыцкі прыводзіць прыклад перапісу 1931 года, калі на Палессі было «зарэгістравана каля 700 тысяч чалавек, якія не назвалі сваёй роднай мовай украінскую. Мову, на якой яны размаўлялі (украінскую, звычайна), называлі "тутэйшай", "мясцовай", "хлопскай"» [13, с. 296, 282].

Як адзначалася вышэй, тэрмін «Заходняя Беларусь» польскія гісторыкі звязваюць выключна з КПЗБ і тэрыторыю Заходняй Беларусі вызначаюць па населеных пунктах, у якіх яна дзейнічала. Калі прымаць варыянт паходжання тэрміна «Заходняя Украіна» ад Камуністычнай партыі Заходняй Украіны (КПЗУ), то неабходна адначыць, што КПЗУ ўзнікла не адразу. Першапачаткова ў лютым 1919 года была ўтворана Камуністычная партыя Усходняй Галіцыі (КПУГ), якая пазней раскалолася на КПУГ-афіцыйную і КПУГ-апазіцыйную. КПЗУ ўтварылася ў чэрвені 1923 года праз аб'яднанне дадзеных партый у выніку катэгарычных патрабаванняў Камінтэрна. Дзейнасць новай партыі распаўсюдзілася на ўсе ўкраінскія землі ў складзе Польшчы [13, с. 301]. Такім чынам, да ўмяшальніцтва Камінтэрна ўкраінскія камуністы стварылі партыю, у назве якой фігуравала не Заходняя Украіна, а гістарычнае паняцце «Усходняя Галічына». Неабходна адзначыць, што Камінтэрн сачыў, каб тэрыторыі дзейнасці КПЗБ, КПЗУ і Камуністычнай партыі Польшчы (КПП) не перасякаліся. Гэтыя тэрыторыі, вызначаныя камуністамі, могуць разглядацца як адзін з варыянтаў размежавання Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі.

Сучаснай, заснаванай на заходнееўрапейскай метадалогіі, з'яўляецца кніга Львоўскага даследчыка Я. Грыцака «Нарысы гісторыі Украіны: фарміраванне сучаснай украінскай нацыі XIX—XX стагоддзя» [20]. Я. Грыцак сцвярджае, што Заходняя Украіна не з'яўляецца ўстойлівым гісторыка-геаграфічным паняццем, і дадзены рэгіён ахоплівае тэрыторыю, якая да 1939 года не знаходзілася пад уладай Расіі і Савецкага Саюза. Пасля завяршэння першай сусветнай вайны тэрыторыя Заходняй Украіны стала значна большай, чым яна была падчас габсбургскай улады. І аўтар пералічвае яе канкрэтныя гісторыка-геаграфічныя рэгіёны: Валынь, Палессе і Холмшчына, якія ўвайшлі ў склад адноўленай Польскай дзяржавы, Бесарабія, якая трапіла пад уладу Румыніі [20, с. 340]. Вучоны не абмяжоўвае заходнеўкраінскія землі толькі міжваеннай Польшчай: «Заходнеўкраінскія землі ў перыяд з 1919 па 1939 год падзялілі між сабой тры дзяржавы — Польшча, Румынія і Чэхаславакія» [20, с. 341]. Аўтар таксама адзначае, што палякі не прызнавалі тэрмін «Усходняя Галічына», які мог прэтэндаваць на пэўную аўтаномію, і выкарыстоўвалі для гэтых тэрыторыі назву «Усходняя Малапольшча» [20, с. 347].

І. Васюта ў сваёй манаграфіі, вывучаючы грамадска-палітычны рух у Заходняй Украіне, удакладняе, што Заходняя Украіна складаецца з Усходняй Галічыны і Заходняй Валыні [21, с. 3].

Ва Украіне на сённяшні дзень выдадзена досыць многа агляднях «Гісторый Украіны», як аўтарскіх, так і калектыўных, а таксама падручнікаў. Аўтар сучаснага агляднага пяцітомніка «Нарысы навейшай гісторыі Украіны» А. Руснaчэнка выкарыстоўвае агульную назву «заходне-ўкраінскія землі», але толькі ў найменні раздзела. У тэксце ідзе канкрэтызацыя:

Усходняя Галіцыя, Валынь, Холмшчына, Падляшша, Палессе. Упамінаецца і тэрмін «Заходняя Беларусь» у якасці абазначэння зямель, населеных беларусамі [22, с. 535].

Пасля Другой сусветнай вайны ва УССР, а пазней у незалежнай Украіне назва «Заходняя Украіна» выкарыстоўваецца яшчэ і як геаграфічны тэрмін у двух значэннях: 1) сучасныя Львоўская, Тарнопальская і Івана-Франкоўская вобласці; 2) сем абласцей: да вышэйзгаданых дадаюцца Валынская, Ровенская, Чарнавецкая і Закарпацкая.

**Заключэнне.** Назвы «Заходняя Украіна» і «Заходняя Беларусь» актыўна выкарыстоўваліся савецкімі публіцыстамі, гісторыкамі і палітыкамі. Гэтымі тэрмінамі абазначаліся землі, што ўваходзілі ў склад Польшчы, населеныя беларусамі і ўкраінцамі, на якія прэтэндаваў Савецкі Саюз. Для беларускай гістарыяграфіі сітуацыя фактычна не змянілася і ў постсавецкі час. Праўда, у вызначэнні дакладных межаў Заходняй Беларусі існуе некалькі варыянтаў, але беларуская гістарычная навука пакуль адназначна не спынілася ні на адным з іх. У. М. Міхнюк прапаноўвае лічыць назву «Заходняя Беларусь» не палітычнай, а чыста геаграфічнай, якая ўзнікла значна раней за 20-я гады ХХ стагоддзя [1, с. 20]. А. А. Савіч лічыць магчымым больш дакладна вывучыць нацыянальны склад насельніцтва рэгіёна і на яго аснове вызначыць тэрыторыю Заходняй Беларусі.

У сучаснай украінскай гістарычнай навуцы назва «Заходняя Украіна» не з'яўляецца адназначным гісторыка-геаграфічным тэрмінам. У розныя гістарычныя перыяды і ў розных гістарычных умовах дадзены тэрмін абазначаў розныя тэрыторыі. Тэрмін «Заходняя Украіна», у адрозненне ад тэрміна «Заходняя Беларусь», сёння не мае адназначнай прывязкі да міжваеннай Польшчы. Ён працягвае выкарыстоўвацца, але часцей у сучаснай украінскай гістарычнай літаратуры ўжываюцца традыцыйныя назвы гісторыка-геаграфічных рэгіёнаў: Усходняя Галічына, Заходняя Валынь, Холмшчына, Падляшша, Палессе. Тэрмін«Заходняя Украіна» часцей выкарыстоўваецца для агульнага абазначэння вышэйпералічаных рэгіёнаў, прычым як усіх разам, так і некаторых з іх.

### Спіс цытуемых крыніц


1. *Міхнюк, У. М.* Заходняя Беларусь: да пытання тэрыторыі і насельніцтва (гістарыяграфічныя нататкі) / У. М. Міхнюк // Беларус. гістар. часоп. — 2004. — № 11. — С. 14—21.
2. *Трафімчык, А.* Заходняя Беларусь у часе і прасторы. Заўвагі да праблемы генезісу і лакалізацыі паняцця / А. Трафімчык // ARCHE — Пачатак. — 2014. — № 7—8 (128—129).— С. 15—53.
3. *Мілеўскі, Я. Е.* Заходняя Беларусь: да пытання тэрыторыі і насельніцтва / Я. Е. Мілеўскі // Беларус. гістар. часоп. — 1998. — № 3. — С. 40—42.
4. *Шумскі, Я.* Саветызацыя Заходняй Беларусі (1944—1953 гг.). Прапаганда і адукацыя на службе ідэалогіі / Я. Шумскі. — 2-е выд. — Смаленск : Інбелкульт, 2014. — 326 с.
5. *Савіч, А. А.* Айчынная гістарыяграфія гісторыі Заходняй Беларусі 1921—1939 гадоў : манаграфія / А. А. Савіч. — Брэст : БрДУ, 2019. — 300 с.
6. *Загідулін, А. М.* Беларускае пытанне ў польскай нацыянальнай і канфесіянальнай палітыцы ў Заходняй Беларусі (1921—1939 гг.) : манаграфія / А. М. Загідулін. — Гродна : ГрДУ, 2010. — 187 с.
7. *Верменич Я. В.* Західна Україна як термін [Електронний ресурс] / Я. В. Верменич // Енцикл. історії України: Т. 3: Е-Й / редкол.: В. А. Смолій (голова) та ін. ; НАН України. Інститут історії України. — Київ : Наукова думка, 2005. — 672 с. — Рэжым доступа: http://www.history.org.ua/?termin=Zakhidna_Ukr_termin . — Дата доступа: 12.12.2021.
8. *Bergman, A.* Sprawy białoruskie w II Rzeczypospolitej / A. Bergman. — Warszawa : PWN, 1984. — 288 s.
9. *Коўкель, І. І.* Аб паходжанні тэрміну «Заходняя Беларусь», яе тэрыторыі, нацыянальным і канфесійным складзе насельніцтва (1921—1939 гг.) / І. І. Коўкель // Этносоциальные и конфессиональные процессы в современном обществе : материалы Междунар. науч. конф., Гродно, 16—18 нояб. 1999 г. / Гродн. гос. ун-т. — Гродно : ГрГУ, 2000. — С. 407—415.
10. *Васюта, І. К.* Соціально-економічні відносіны на селі Західної України до воз'єднання / І. К. Васюта. — Львів : Вища шк., 1978. — 192 с.
11. *Гаврілів, І. О.* Західна Україна у 1921—1941 роках : нарис історії боротьбы за державность / І. О. Гаврілів : монографія. — Львів : Вид-во Львів. політехніки, 2012. — 472 с.

12. *Зуляк, І.* Діяльность «Просвіты» у Західнії Україні в міжвоєннії період (1919—1939) / І. Зуляк. — Тернопіль : Воля, 2005. — 346 с.

13. *Кульчицкий, С.* Украина між двома війнами // Україна крізь віки. У 15 т. — Т.11. — Кіїв : Альтернатива, 1999. — 336 с.

14. *Марківська, Л.* Українська інтелігенція Волині між двома світовими війнами / Л. Марківська : автореф. дис. … канд. іст. наук : 07.00.01 — Історія України / Чернів. нац. ун-т ім. Ю. Федьковича. — Чернівці, 2003. — 14 с.

15. *Раєвич, Т.* Український жіночий рух на Волині (1921—1939 роки) : автореф. дис. … канд. іст. наук : 07.00.01 — Історія України. / Т. Раєвич ; Чернів. нац. ун-т ім. Ю. Федьковича. — Чернівці, 2006. — 20 с.

16. *Доброчинська, В.* Інтелігенція в культурному житті Західної Волині (1921-1939) : автореф. дис. … канд. іст. наук за спец. 07.00.01 — Історія України / В. Доброчинська ; Ін-т українознавства ім. І. Крип'якевича НАН України, Ін-т народознавства НАН України. — Львів, 2006. — 20 с.

17. *Борщевич, В.* Українське церковне відродження на Волині (20—40-ві рр. XX ст.) : монографія / В. Борщевич:. — Луцьк : РВВ «Вежа» Вол. держ. ун-ту ім. Лесі Українки, 2000. — 254 с.

18. *Пономаренко, С.* Культурно-освітні організації Волині 1921—1939 рр.: дис. … канд. іст. наук : 07.00.01. — історія України. / С. Пономаренко ; Волин. нац. ун-т ім. Лесі Українки. — Луцьк, 2001. — 226 с.

19. *Степанюк, С.* Театральне життя Волинського воєводства 1921—1939 рр. / С. Степанюк : автореф. дис. … канд. іст. наук. 07.00.01 — Історія України / Волин. нац. ун-т ім. Лесі Українки. — Луцьк, 2011. — 20 с.

20. *Грицак Я. Й.* Нарис історії України: Формування модерної української нації XIX — XX ст. / Я. Й. Грицак. — Киів : Yakaboo, 2019. — 656 с.

21. *Васюта, І. К.* Політична історія Західної України (1918—1939) / І . К. Васюта. — Львів : Каменяр, 2006. — 335 с.

22. *Русначенко, А.* Нариси новітньоі історіі України : у 5 кн. / А. Русначенко. — Київ : Олег Філюк, 2015. — Кн. 2. — 716 с.

Паступіў у рэдакцыю 01.03.2021.